Cana numaru 10 hr.

Przesyłka opłacona ryczałtem.

Nr. 4 (697). Wilnia, Čaćwier 15 Krasawika 1937 h. Hod XX.

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adrys Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9-taj hadz. ranicy da 4-taj wieč.

Hazeta wychodzić raz ŭ tydzień.

Koštу wydawańnia pakrywajuć składki. Składka ŭ hod 4 zał., na pałhoda—2 zał., na 3 mies.—1 zał. Cana abwiestak pawodle ŭmowy.

Расейшчына сярод Беларусаў

На беларускіх землях Польскай Дзяржавы існуе даволі значны лік расейцаў. Гэткімі зьяўляюцца: стараверы, эмігранты, расейцы сьвяшчэньнікі і астаткі бытшага царскага, прыбыўшага з этнографічнай Расеі, чынавецтва. Да расейцаў часта так-жа залічаюць і частку праваслаўных абрусеўшых беларусаў, хоць гэтыя, ясная справа, гэткімі не зьяўляюцца.

Перавага расейскай культуры ў параўнаньні з маладой беларускай, пры пэўных варунках, гэтай апошняй ёсьць шкоднай і нават небясьпечнай, бо яе спыняе і аслабляе. Небясьпека-ж гэта ёсьць яўнай тады, калі характар расейшчыны набірае адзнак культурнай заборчасьці, інгеруе на беларускія этнічныя тэрыторыі і корміцца коштам беларускага народу.

Прынцыповыя нашы адносіны да расейцаў, як і да ўсіх іншых нашых суседніх народаў, сформуляваныя нашай (БНА) праграмай. Арт. 1: БНА трымаецца прынцыпу самастаноўленьня народаў. Арт. 3: БНА ліча сваім ідэалам, каб беларускі народ меў добрыя адносіны з усімі народамі на падставе ўзаемнасьці, роўнасьці і міжнароднай справядлівасьці. Арт. 4: БНА за роўныя правы для ўсіх грамадзян. Арт. 7: Кожная нацыянальнасьць мае права карыстацца сваей мовай у агульна-грамадзкім і палітычным жыцьці. Арт. 11: Навука ў школах павінна адбывацца ў роднай бацькаўскай мове дзяцей. Арт. 17: БНА за тое, каб рэлігійныя ўстановы, у сваей рэлігійнай працы, як у сьвятынях, школах і інш., карысталіся роднай мовай сваіх верных.

Вось гэткія нашыя адносіны да суседніх народаў і да суседняга народу расейскага. Небясьпекай-жа расейскай называем факт, калі расейцы гэтыя нашыя праграмовыя нормы адносна нас, беларусаў, пераступаюць і гэтым самым надужываюць і ламаюць прыродныя нацыянальныя правы беларускага народу. У нашых сучасных варунках гэта здараецца такім чынам:

Расейская прэса, якая пашыраецца ня толькі сярод расейцаў, але якая йдзе і ў беларускія праваслаўныя гушчы, нясе туды часта думку высшасьці расейскай нацыі і культуры, думку расейскай культурнай і палітычнай заборчасьці. Часта можна спаткаць у расейскіх нават краёвых газэтах, якія пасылаюцца ў наш народ для расейскай прапаганды, думку, што беларусы — гэта тыя-ж расейцы, якія забыліся, ці якія яшчэ не навучыліся адзінай для ўсіх усходніх славян расейскай мовы.

Праваслаўная Царква ў Польскай Дзяржаве праз расейцаў сьвяшчэньнікаў, асабліва праз вышэйшае, нацыянальна пераважна расейскае духавенства, упорыста трымаецца ў пропаведзях расейскай мовы. Робіцца гэта як сярод украінскага праваслаўнага народу, так і сярод беларускага. Няпрыхільнасьць, каб не сказаць больш, да таго вялікая ў праваслаўным расейскім духавенстве да беларускага народу і да яго мовы, што яно хутчэй згаджаецца заводзіць па цэрквах на беларускіх тэрыторыях мову польскую ў самую нават літургію, як карыстацца беларускай мовай прынамсі ў звычайных пропаведзях.

Праваслаўная Царква праводзіць русыфікацыю сярод беларускага народу так-жа і праз школы, у якіх праваслаўныя прафэкты звычайна карыстаюцца мовай расейскай замест беларускай.

Урэшце расейскія школы, якія існуюць сям-там на беларускіх землях і ў якіх часта бывае нямала беларусаў, вядуцца пераважна ў духу расейскай выключнасьці, а гэтым самым у духу няпрыхільным для беларускай нацыі.

Гэткага роду і яму падобная небясьпека расейшчыны для беларускага народу зазначаецца і востра адчуваецца беларусамі асабліва цяпер, калі нябывала цяжкі мамэнт перажывае справа беларускай школы, беларуская прэса і справа беларускіх культурна - асьветных арганізацыяў.

Небясьпека для нас расейшчыны прадстаўляецца нам яшчэ ярчэй, калі прыпомнім так-жа адносіны да расейцаў і да беларусаў польскай эндэцкай палітычнай партыі, пад якую няраз падшываюцца розныя псэўдо-дэмакраты, санатары і інш. А сутнасьць гэтых адносінаў вось у чым: паводле іх трэба паддзержаваць расейскасьць сярод беларусаў, а не дапушчаць беларускасьці і з ей бароцца, бо расейцы як элемэнт, ня маючы ў беларускім народзе этнічных падстаў, лёгка спалёнізуюцца, а беларусы вырастаюць у асобную нацыю, якая, паводле гэных палітыкаў, зусім непатрэбная і нават шкодная Польшчы. Тымчасам з гэткай палітыкі шырыцца непатрэбны і іменна шкодны антаганізм між народамі на ўсходзе Эўропы і вырастае коштам беларускага народу расейскі імпэрыялістычны нацыяналізм, які сапраўды ня толькі шкодны, але і небясьпечны як для беларускага народу, так і для польскага, калі ня сяньня, дык заўтра. Польскі народ і расейскі гэткай палітыкай павінен толькі брыдзіцца, бо яна ёсьць крыўдай для беларусаў і да дабра не вядзе. Не заборчасьць, не асыміляцыя, але сужыцьцё ўсіх суседніх народаў на падставе прызнаваньня ўзаемных нацыянальных праваў—вось прынцып міжнародных суадносінаў.

Адцеміўшы такім чынам у дужа агульных словах факт расейскай для беларусаў небясьпекі на беларускіх землях, мусім так-жа сьцьвердзіць патрэбу процістаўіцца ей. А чым? А чым можна! Мусім далей праводзіць беларускае народнае ўсьведамленьне, мусім старацца здабыць школу ў роднай мове, мусім пашыраць больш інтэнсыўна хоць тыя беларускія газэты, якія ў нас існуюць, а так-жа пашыраць усімі даступнымі нам спосабамі беларускую кніжку.

Беларускі культурны ўзрост карысны ня толькі беларускаму народу, але так-жа і народам суседнім. Роўнавага і гармонія сужыцьця народаў — гэта сапраўды вялікі культурны ідэал...

Шукаюць дарог у сяло

У Вільні ў суботу 3 красавіка сёл. адбыўся сход мясцовых (з Віленшчыны і Навагрaдчыны) „землеробаў з вышэйшай асьветай“.

Аб гэтым сходзе беларускі папулярна - гаспадарскі часапіс „Самапомач“ у № 4 зьмяшчае артыкул гэткага зьместу.

— Шуканьне дарог да сялянства—справа ня новая. Ня цэлы год таму назад у Варшаве адбыўся ўсепольскі зьезд „дзеля падняцьця культуры вёскі“. Аб рэальных працах гэтага зьезду да сягоньня няяк глуха. А вось больш-менш каля новага сёлетняга году ведамым сталася анкета (апытальнік) генэрала Л. Жэлігоўскага да ўсіх гмін і грамадаў Віленскага ваяводзтва аб тым, **што, хто і як думае рабіць дзеля падняцьця дабрабыту нашых вёсак.** Аб рэзультатах гэтага апытальніка і аб сваіх высначках і гаварыў на ўспомненым суботнім сходзе ў Вільні генэрал Л. Жэлігоўскі. Гаварылі на гэтым сходзе і іншыя прысутныя, а аб супольна намечаным пляне працы Віленскае „Słowo“ між інш. напісала: *„Каб-жа ён* (плян) *знайшоў сваіх выканаўцаў... Тады ген. Жэлігоўскі выбавіць Віленшчыну другі раз“.* — Першы раз — паводле думкі польскаабшарніцкага рэдактара—ген. Ж. выбавіў Віленшчыну ў 1920 годзе, калі на чале польскага войска заняў яе і гэтым даў магчымасьць фармальна далучыць да Польшчы.

Што-ж даведаліся прысутныя на ўспомненым сходзе 3.IV.1937?

Ген. Жэлігоўскі даволі востра скрытыкаваў дагэтуляшні спосаб працы як у землеробскіх, так і ў самаўрадавых арганізацыях. Прысутныя зразумелі, што так званыя дабравольныя землеробскія арганізацыі па нашых сёлах жывуць і праядаюць агульна-грамадзкія грошы з ,падаткаў. Належаньне да такой арганізацыі гэта сыты прывілей да таго часу, пакуль арганізаваных сяброў няшмат. Разрост такой „арганізацыі“ азначаў-бы здрабненьне прывілеяў. І таму гэтыя „дабравольныя арганізацыі“, будаваныя абяцанкамі розных прывілеяў, у нас не разрастаюцца — ня маюць на гэта падставаў.

„Конікам“ генэрала Жэлігоўскага аднак ёсьць гэтак званы самаўрад тэрыторыяльны: гміна, сяло (грамада). І тут не вясёла. З 96-цёх адказаў на ўспомнены апытальнік, прысутныя на сходзе даведаліся, што закон аб самаўрадах у нас ня выконваецца. Войты лічацца толькі з старастамі і ня лічацца з выбаршчыкамі. У гмінах вытвараўся й трымаецца шкодны тып „самаўрадавых прафэсыяналаў“, якія замест працаваць для дабра самаўраду, вядуць закулісныя інтрыгі.

Ажыўленьне самаўрадавага і гаспадарскага жыцьця ўсе прысутныя на сходзе ўважалі за канешнае, каб зьвязаць жыхара нашае вёскі з Польшчаю. Гміна павінна працаваць з уласнае ініцыятывы, не „з наказу з-гары“, а ў жыцьці гаспадарскіх арганізацый трэба

імкнуцца да масавасьці, выкідаючы стуль выпадковае „zbiorowisko ludzi często słabych i sprzedajnych“. У аканчальным слове адзін з прысутных (праф. Ластоўскі) выразіў думку, што ўсе гэтыя намеры будуць выкананы, бо за іх ўзяўся ген. Жэлігоўскі.

Гэтулькі аб успомненым сходзе ведаем з польскіх газэт.

Можа гэтыя весткі ня поўныя. Але калі яны адпавядаюць сапраўднасьці, калі на ўспомненым сходзе сапраўды ня было гутаркі аб нічым іншым, як толькі тое, што падала польская прэса, дык пазволім сабе выразіць

1. наша найглыбейшае зьдзіўленьне над аднабокасьцю нарадаў, ведзеных людзьмі з вышэйшай адукацыяй і

2. пераканаьне, што і гэтыя пастановы астануцца пастановамі на паперы, хоць-бы ім патронаваў нават так высокі аўторытэт, як ген. Жэлігоўскі.

Чаму?

Бо як самаўрадавае, так і гаспадарскае жыцьцё, калі яно мае быць жыцьцём, павінна апірацца на мясцовым насельніцтве, бяручы пад увагу ягоны **склад і патрэбы**. Сход „земляробаў“ 3.IV.37 г. у Вільні гэтага „не дагледзіў“: ні паўсловам не дакрануўся да тае праўды, што ў сёлах Віленшчыны жывуць **і беларусы і літоўцы...**

Беларусаў і літоўцаў у сёлах Віленшчыны абмінуць ня можна!

Кангрэс Нацыянальных Меншасьцяў

Кангрэс Нацыянальных Меншасьцяў сёлета склікаецца ў Лёндан на 7—9 ліпня. У параўнаньні з кангрэсамі мінулых гадоў, сёлетні Кангрэс зусім не прадбача публічных дыскусій, а паасобныя прамоўцы будуць прамаўляць ад імя Кангрэсу як цэласьці. Спаміж васьмёх праграмова-ідэолёгічных рэфэратаў і справаздач, адзін рэфэрат на тэму „Этычныя асновы нацыянальнага й культурнага разьвіцьця“ прызначаны для прадстаўніка ад беларусаў з Польшчы. Гэта тэма спэцыяльна прызначаная дзеля азнаямленьня англіцкага сьвету з пытаньнем нацыянальных меншасьцяў Эўропы.

Арганізатары Кангрэсу рахуюцца з прысутнасьцю на кангрэсе такіх прадстаўнікоў англіцкага палітычнага жыцьця, як Лёйд-Джордж, Діккінсон і інш.

У Украінцаў.

У справе Усеукраінскага Кангрэсу. Ужо два гады таму, як паўстала сярод украінскай эміграцыі ініцыятыва скліканьня ўсеўкраінскага Кангрэсу. Гэта справа сярод украінскай эміграцыі ўсьцяж актуальная і трэба спадзявацца, што Кангрэс гэткі будзе скліканы.

Аўтаномія Закарпацкай Русі. Чэхаславацкі ўрад апошнімі часамі выказаў згоду на аўтаномію для Закарпацкай Русі і прыступіў да праўнага афармленьня гэтай аўтаноміі. Рэалізацыя аўтаноміі мае праводзіцца паступова — этапамі.

Румынскі тэрор адносна Украінцаў. Ня лёгка Украінцам жывецца пад Румыніяй. Арышты, рэвізіі і канфіскаты прэсы — гэта частыя выпадкі. Апошнімі часамі румынская ўлада спыніла адзіную там штодзенную украінскую газэту „Час“ і апячатала рэдакцыю.

З беларускага жыцьця

Выехаў лячыцца. У нядзелю 4 г. м. ведамы беларускі дзеяч Кс. Ад. Станкевіч выехаў з Вільні ў Трускавец (Галіччына) лячыцца. Кс. Ад. Станкевіч ужо колькі год вельмі цярпеў ад хворасьці нырак. Хвароба гэта астатнім часам на гэтулькі пачала дакучаць, што Паважаны хворы быў змушаны часова перарваць сваю цэнную работу і выехаць на нейкі час у Трускавец, дзе знаходзяцца спэцыяльныя лячэбныя крыніцы. — Кс. Ад. Станкевічу жадаем хуткага выздараўленьня і павароту да працы.

Зьнялі канфіскату. Пастановай Віленскага Акружнога Суду з 18 сакавіка сёл. зьнята канфіската аднаднёўкі „Беларуская Доля“ (сакавік, 1937 г.), наложаная пісьмом Віленскага Гарадзкога Старасты з дн. 11 III.1937 г.

„Снапок“. Мітрапалітальнае „Слово“ падае, што хутка мае выходзіць, як бясплатны дадатак да гэтай газэты, беларускі царкоўны і культурна-асьветны часапіс для дзяцей з ілюстрацыямі. У справах рэдакцыйнага характару гэтага часапісу трэба зварочвацца да грам. Сяргея Паўловіча: Вільня, вул. Папоўская 9—4.

„З сялянскіх ніў“. Гэтымі днямі выйшла пад гэткім загалоўкам кніжыца — зборнік вершаў Міхася Васілька. Кніжыца мае 32 бачыны, разьмеру 8⁰. Выданьне Р. Шырмы.

U Litoŭcaŭ

Z žyćcia T-wa „Rytas“.

21.III sioleta adbyŭsia ahulny hadawy schod siabroŭ T-wa „Rytas“. Na hetym schodzie staršynia T-wa Ks. K. Čibiras zrabiŭ sprawazdaču za čas od 20.III.1936 h. Z sprawazdačy dawiedwajemsia nastupnaje: 20.III.36 h. T-wa mieła pad swaim kiraŭnictwam 74 čytalni pa litoŭskich siołach. Sioleta T-wa maje 14 čytalniaŭ. Takim čynam ad 20.III.1936 da 21.III 1937 h. było śpiarša strymana, a paśla j całkom zakryta 60 čytalniaŭ. Da swajho zakryćcia čytalni henyja pracawali ŭ hetkim liku ŭ nastupnych pawietach: 16 u Wilenska-Trockim, 2 ŭ Świancianskim, 20 u Lidzkim, 1 u Aśmianskim, 2 ŭ Suwalskim i 18 u Haradzienskim.

Pry zakryćci čytalniaŭ uładami byli zabranyja j knižki, jakija tam znachodzilisia. Dahetul u-wa ŭsich pawietach, za wyniatkam Wilenska-Trockaha, knižki henyja byli T-wu źwiernuty. Heta jość dokazam, što nielehalnych knižak u litoŭskich čytalniach nia było.

Praz hety čas T-wa nie załažyła ani adnej nowaj čytalni. Aprača taho Biełastocki wajawoda zabaraniŭ usiakuju dziejnaść T-wa ŭ pawietach Suwalskim i Haradzienskim, jak u pawietach pryhraničnych.

Z začynieńniem čytalniaŭ, T-wa „Rytas“ musiła admowić pracu kiraŭnikom ich. Woś-ža biezrabotnyja kiraŭniki, jakija płacili ŭ „Ubezpieczalniu Społeczną“ padatki, źwiarnulisia ŭ hetu ŭstanowu z prośbaj zapamohi. Usim adnak admowili. U admowie skazana, što kiraŭniki litoŭskich čytalniaŭ stracili pracu... z ułasnaj winy!

Paśla hetaha biezrabotnyja kiraŭniki čytalniaŭ pierawažna astalisia žyć na siale. Mnohich administracyjnyja ŭłady pakarali štrafam, a heta za toje, što jany byccam wiali prociŭdziaržaŭnuju pracu. Pakaranyja źwiarnulisia ŭ Sud i ŭsie sprawu wyjhrali.

25.XI.36 h. ŭ T-wie „Rytas“ i ŭ mnohich siabroŭ T-wa palicyja zrabiła rewiziju. T-wa „Rytas“ padało memorjał Prezydentu Polščy, u jakim šyroka apisała sprawu litoŭskaj aświety ŭ našym Krai.

Ab Litoŭskaj Himnazii im. Witaŭta Wialikaha ŭ Wilni zrabiŭ dakład dyr. M. Šikšnys. Z dakładu hetaha miž inšym dawiedwajemsia, što ŭ himnazii wučycca ciapier 212 wučniaŭ: 136 chłapcoŭ i 76 dziaŭčat. Usie wučni — litoŭcy. Himnazijalnaja biblijateka maje 4993 knižki, z jakich — 2610 (52 prac.) litoŭskija, 1665 (33 prac.) polskija i 718 (15 prac.) niamieckija.

(*„Viln. Ryt.“ 2.IV.37*).

Usie pad ściaham dziaržaŭnaj abarony

Klič dziaržaŭnaj abarony šyroka razlahajecca pa ŭsiej Polščy. Usie palityčnyja i hramadzkija arhanizacyi ŭ Polščy swaju dziejnaść nakiroŭwajuć na šlach konsalidacyi i hramadzkaha ŭzmacnieńnia dziela źwialičańnia siły, patrebnaj dziela abarony niezaležnaści palityčnaj, ekanamičnaj i kulturnaj. Z hetkimi kličami jdzie ŭ narod Polskaja Partyja Socyjalistyčnaja (PPS), hetkija kličy niasie ŭ sialanskija masy „Stronnictwo Ludowe,“ ab hetym ŭściaž napaminaje endecyja z swaimi nacyjanalistyčnymi razhałuzinami, z hetkim kličam paŭstała i nowaja palityčnaja arhanizacyja „Obóz Źjednoczenia Narodowego“ (O.Z.N.).

Pajaŭleńnie, farmalna nowaj, palityčnaj arhanizacyi (O.Z.N.) wyklikała siarod apazycyjnych uhrupawańniaŭ palemiku, u jakoj apazycyja šukaje miejsca dla hetaj arhanizacyi, i pierahrupoŭku ŭ h. zw. sanacyjnym łahiery.

Nowaja palityčnaja arhanizacyja O.Z.N. užo pryniała arhanizacyjnuju formu. Jana źjaŭlajecca arhanizacyjaj nacyjanalna polskaj. Arhanizujecca O.Z.N. u łonie h. zw. sanacyi, abjednywajučy hrupy i paasobnych dziejačoŭ daŭniejšaha B.B. Dasiulešni razwoj hetaj arhanizacyi apazycyjnych partyjaŭ nie kasuje, a takža nia ŭśpieŭ abjadnać i ŭsich hrupaŭ, što stajali pad ściaham B.B.

Jakaja rola budzie ŭ historyi adrodžanaj Polščy OZN—ciapier hadać trudna. Na praznačeńnie i sučasnaje značeńnie OZN pakulšto pakazwaje tolki woś hety fakt.

—Prezydent Polščy praf. I Maścicki ŭ dzień imianinaŭ marš. Piłsudzkaha — 19 sakawika — skazaŭ u radyjo pramowu ab patrebie jednaści ŭ całym narodzie. Prezydent prypaminaŭ značeńnie i zasłuhi dla Polskaha narodu marš. Piłsudzkaha i scharakteryzawaŭ sučasnaje pałažeńnie ŭ Polščy. „My—kazaŭ Prezydent — jašče nie abjednanyja i pad pahladam psychičnym jašče mocna razbrojenyja.“

Dalej Prezydent, haworačy ab patrebie zhody ŭ narodzie i ŭspaminajučy słowy marš. Rydza-Śmihłaha, katory padaŭ „klič abarony Polščy,“ pakazaŭ na pałk Koca, jakomu marš. Rydz-Śmihły daručyŭ stwaryć nowuju palityčnuju arhanizacyju ŭ Polščy.

Prezydent zakončyŭ swaju pramowu pieraściarohaj tych, katoryja ŭ partyju pałk. Koca (OZN) ustupać nia chočać i jaje postulaty krytykujuć. „Hrupy tych ludziej — kazaŭ Prezydent — i ich partyi budue pastupowa tajać i ŭ kancy jany sami ŭbačać, što jany słabyja, kab ustrymać stychijnaje źjawišča.“ —

Polskaja presa, jak sacyjalistyčnaja („Rabotnik“), taksama i abšarnickaja („Słowo“) ćwierdziać, što ŭ Polščy dla manopartyi niama ani miejsca, ani patreby. Ćwierdžańnie swajo hetaja presa apiraje na toj praŭdzie, što ŭ Polščy jość treciaja čaść usich ludziej *narodnych mienšaściaŭ* i było-b naiŭnaściaj wieryć, što hetyja narodnyja mienšaści možna abjadnać polskaj manopartyjaj. A kali im —narodnym mienšaściam, treba dać swabodu ideolohičnaha samaaznačeńnia, dyk i Palakom nielha zabaranić hetaha.

Słowam, monopartyjnaść u Polščy nia maje padstaŭ dziela raźwićcia, bo skład nasielnictwa Polskaj respubliki i roznajakija jaho intaresy wymahajuć demakratyčna-parlamantarnaha ładu, jaki šyrej abjednywaje na ahulnaj hałoŭnaj platformie narodnyja masy, čymsia monopartyjny ład.

Pryhetym treba adznačyć i hety fakt, što dasiulešniaje pastupańnie i samych arhanizataraŭ OZN nie pakazwajuć na biezahladnyja pretensii da monopartyjnaści, a tak-ža nia widać hetaha i z adnosinaŭ uradawych dziejnikaŭ — ministr Sprawiadliwaści Grabowski aficyjalna wyjaśniŭ, što ani prakurory, ani suddzi ŭ OZN ustupać nie pawinny, taksama, jak nia mohuć naležać i ŭ inšyja partyi.

Z hetaha bačym, što i ŭradawyja kruhi na šlach monopartyjnaści aficyjalna nie stanowiacca.

Monopartyjnaść wyklučaje ŭ Polščy ahulny nastroj patryjatyčny, jaki wyjaŭlajecca na pieršym miejscy kožnaj hrupy i partyi. Słowam, usie pad ściaham dziaržaŭnaj abarony.

Ci nia źmiena niamieckaj zahraničnaj palityki?

Niamieččyna šukaje sabie prastoraŭ, kab pašyryć swajo terytoryjalnaje ŭładańnie dziela ich eksploatacyi na karyść Niemcaŭ. Niadaŭna premjer Gieryng zajawiŭ publična, što Niemcy majuć 23 miljony haktaraŭ wyrablenaj ziamli, a kab Niamiecki narod moh samawystarčalna pražywać treba jašče 16 miljonaŭ haktaraŭ ziamli.

Voś-ža dziela šukańnia hetych wialikich i „wolnych“ abšaraŭ dla Niemcaŭ i źjaŭlajecca hałoŭnaj zadačaj hitleraŭskaj palityki.

Dasiul niamieckija hitleraŭskija dyplamaty widzieli hetyja 16 miljonaŭ hakt., byccam praznačanyja dla Niemcaŭ, na ŭschodzie Eŭropy— na Ukrainie, Biełarusi i ahułam na abšarach, što znachodziacca pad uładaj Sawietaŭ. Ale kab zaŭładać hetymi abšarami śpiarša treba ich zawajawać, bo dabrawolna nichto nia ŭstupić, a kab pajšci tudy wajnoj patrebny dostup i adpawiednaja siła. Dziela hetaha zaklučany sajuz miž Niamieččynaj i Japonijaj i dziela hetaha wiałasia ŭ hetym kirunku niamieckaj dyplamacyjaj zahraničnaja palityka.

Hetyja namahańni niamieckaj palityki akazalisia adnak biezrezultatnymi.

Apošnimi časami stalisia takija fakty, katoryja pakazwajuć, što Niamieččyna, choć i nie wyrakajecca swaich wyšej apisanych planaŭ, to byccam pakidaje ich na druhim miejscy, wysoŭwajučy na pieršaje miejsca druhija sprawy i druhi plan.

Hety druhi plan palahaje na tym, što Niamieččyna hatowa ciapier zaklučyć dahawor z SSSR dobrasusiedzkaha sužyćcia i pakirawać swaje imknieńni ekspansii na paŭdzionny ŭschod Eŭropy — u basen Dunaju. Pawodle hetaha planu, Niamieččyna tam stwaryła-b fedaracyjny dziaržaŭny arhanizm z 150 miljonaŭ narodu, a hetki fakt zusim źmianiŭby palityčnaje mižnarodnaje pałažeńnie ŭ Eŭropie i tady Niamieččyna asiahnuła-b toje, da čaho imkniecca nie kanieśnie na eŭrapejskim kantynencie.

Hetki wialiki plan Niamieččyna ŭważaje, što mahła-b zrealizawać tolki ŭ parazumieńni z SSSR. Kali-b sapraŭdy da hetaha dajšło, dyk u pieršuju čarhu pierastali-b isnawać, jak samastojnyja dziaržawy: Aŭstryja, Wuhryja, Čechasławaččyna, Rumynija i Juhasławija.

Dahadki źmieny hitleraŭskaj Niamieččynaj zahraničnaj palityki ŭzbudžaje takža i fakt zhody Hitlera z hien. Ludendorfam. Francuskija hazety pradbačwajuć, što hetaja zhoda dawiadzie da hruntoŭnaj źmieny niamieckaj palityki adnosna SSSR, bo hien. Ludendorf zdaŭnych jość takich pahladaŭ, što Niamieččyna nikoli nie pawinna swarycca z Rasiejaj, a tolki supracoŭničać.

I sapraŭdy, u pieršyja dni zhody Hitlera z Ludendorfam pačałasia ŭ Niamieččynie zaŭziataja baraćba ŭłady z Katalickim Kaściołam i ahułam chryścijanstwam, jak najbolšym woraham niamieckaj pahanskaj prapahandy, jakoj adnym z neopahanskich prapawiednikaŭ źjaŭlajecca Ludendorf, zahłušajučy hetym dasiulešniuju prapahandu antysawieckuju.

U palityčnych kruhoch Niamieččyny spadziajucca, što Hitler naznačyć hien. Ludendorfa palawym maršałam na miesca zusim staroha maršała Makenzena. Ludendorf tady budzie najbližejšym daradčykam Hitlera ŭ wajennych sprawach i ahułam u sprawach wajennaj palityki sučasnaj Niamieččyny.

Słowam, eŭrapejskija palityki na hety fakt zwaročwajuć uwahu i ličacca z mahčymaściaj źmieny kursu ŭ niamieckaj zahraničnaj palitycy.

З царкоўнага пагосту

Пастановай Сьв. Сыноду дазволена адпраўляць праваслаўную Службу Божу папольску. Гэтую пастанову Царкоўнай улады ў Польшчы некаторыя паветавыя старасты Наваградзкага і інш.ваяводзтваў зразумелі, як абавязак духавенства. Прыкладам Ваўкавыскі стараста, як падае мітрапалітальнае „Слово“ (№ 13, 1937 г.) склікаў 10 сакавіка сёлета праваслаўных настаяцеляў і заявіў ім, каб бяз дыскусіі прынялі да ведама, што ў цэрквах і ў школах, ня толькі ў дні народнага сьвята, але заўсёды трэба карыстацца польскай мовай, а так-жа трэба старацца, каб і Службу Божу адпраўляць папольску. Адначасна стараста падчыркнуў, што за невыкананьне гэтага будзе зроблены належны вывад.

З гэткім распараджэньнем пісьменна зьвярнуліся да мясцовага праваслаўнага духавенства старасты Стаўпецкага і Шчучынскага паветаў.

Вышэйшая духоўная ўлада зьвярнулася да Ураду з прапазыцыяй канешнасьці скасаваньня гэткага распараджэньня старастаў успомненых паветаў.

Baraćba z apazycyjaj unutry kamunistyčnaj partyi ŭ SSSR.

Aryšt Jagody i nowy sud nad starymi balšawikami.

Stalin raspačaŭ baraćbu z starymi balšawikami nie na žarty. Paśla wykryćcia „prawaj“ i „lewaj“ apazycyi ŭ nutry kamunistyčnaj partyi nia spyniajecca i dalejšaja baraćba Stalina z dasiulešnimi pawadyrami kamunizmu na wialikich prastorach SSSR. Na pasiedžańni C. K. usiesajuznaj kamunistyčnaj partyi, jakoje adbyłosia 3 sakawika siol. Stalin zajawiŭ, što ŭ nutry kamunistyčnaj partyi jašče jość hrupy ludziej, jakija wiaduć akcyju prociŭ ciapierašniaha kiraŭnictwa partyi i prociŭ sawieckaha ŭradu. Pryhetym Stalin ściwierdziŭ, što siabry kamunistyčnaj partyi nie wyjaŭlajuć dastatačnaj enerhii, kab supraciwicca apazycyjnaj akcyi. A stałasia heta tamu, — što niama ŭ partyi świedamaha pryrostu i dapływu nowych, świežych siłaŭ, jakija naturalna pawinny prychodzić z maładoha pakaleńnia. Analizujučy nutranoje pałažeńnie Sawietaŭ, Stalin, miž inšym, zajawiŭ, što kirujučaja hrupa ŭ Sawietach składajecca z 3000 adkaznych kamunistyčnych dziejačoŭ, jakaja kiruje 150 miljonnym nasielnictwam i biare adkaznaść za hetki wialiki kraj, jaki stanowić šostuju čaść usiaje ziamli.

Ściwierdžańnie hetaha faktu dakładna ilustruje kamunistyčny demakratyzm u SSSR.

Pryhetym treba adznačyć, što na hetym pasiedžańni C. K. usiesajuznaj kamunistyčnaj partyi pastanoŭlena prawieści nowyja wybary ŭ partyjnyja orhany kompartyi sposabam tajnaha hałasawańnia, kab hetkim sposabam dać mahčymaść dapływu nowych i świežych siłaŭ u kamunistyčny aparat. Ci heta pamoža—spadziawacca trudna.

Paśla hetaha pasiedžańnia C.K. pačałasia dalejšaja baraćba z „prawaj“ i „lewaj“ apazycyjaj ŭ kampartyi. Pačałasia padhatoŭka da sudowaha pracesu, u jakim buduć sudzić starych balšawikoŭ na čale z Bucharynam i Rykawym, a tak-ža pačalisia nowyja aryšty siarod wydatniejšych kamunistaŭ. Aryštawany ŭžo i byŭšy kamisar G.P.U. Jagoda, jaki tak-ža wielmi žorstka raspraŭlaŭsia z usialakaj apazycyjaj i h. zw. kontrewalucyjnym elementam.

„Wyčyścili“ Hikału.

U BSSR. U źwiazku z apošniaj „čystkaj“ u kamunistyčnaj partyi zwolnieny z stanowišča Kam. Partyi Biełarusi M. Hikała, jaki likwidawaŭ „nacdemaŭščynu“ i wysielaŭ biełarusaŭ z rodnaha kraju.

Sajuz Italii z Juhasławijaj

Musolini pajšoŭ na ŭstupki Charwatam i Słowencam.

U źwiazku z palitykaj Italii prociŭ Anhlii italijanski ŭrad šukaje sajuźnikaŭ u eŭrapejskich dziaržawach. Niadaŭna italijanski ŭrad zaklučyŭ dahawor z Juhasławijaj, u jakim, miž inšym, juhasłaŭski ŭrad pryznaje i zawajawańnie Italjaj Abisynii. Paśla zaklučeńnia hetaha dahaworu, jaki maje charaktar haspadarčy, italijanski ŭrad starajecca zaklučyć z Juhasławijaj i sajuz wajennaha charaktaru.

Pryhetym treba adznačyć, što Musolini ŭ hetym palityčnym flircie z Juhasławijaj pajšoŭ na ŭstupki i ŭ nutranoj palitycy ŭ Italii adnosna Charwataŭ i Słowencaŭ — jon zhadziŭsia wiarnuć prawy charwackaj i słowenskaj mowy ŭ žyćci relihijnym i ŭ školnym nawučańni dla hetych narodnych mienšaściaŭ u Italii. Adnačasna Musolini zahadaŭ zwolnić 28 słowencaŭ, jakija prabywali ŭ italijanskaj turmie, zasudžany za abaronu pryrodnych prawoŭ swajho narodu.

Hety fakt maje wialikaje značeńnie dla sprawy narodnych mienšaściaŭ ahułam. Heta pakazwaje, što prablema narodnych mienšaściaŭ, choć jana pastaŭlena niby „nutranoj“ danych dziaržaŭ, usio-ž taki maje mižnarodny charaktar i nawat dyktatarskaja fašystaŭskaja dziaržawa dapuščaje hutarki ab swaich mienšaściach. Pryhetym ściwiardžajecca jašče raz, što žywučaść nacyjanalnych kolektywaŭ nie paddajecca asymilacyi, nijakamu režymu.

Čarhowy eŭrapejski kanflikt

Paśla zawajawańnia Italijaj Abisynii italijanski ŭrad pawioŭ niazwyčajna aktyŭnuju palityku, jakaja źjaŭlajecca ŭ wialikaj miery supiarečnaj z intaresami Anhlii. Anhielski ŭrad na heta adkazaŭ wialikimi zbrajeńniami. Kab źmieracca z Anhlijaj zawarušyłasia ŭ namahańni dalejšaha zbrajeńnia i Italija. Hetaje italijanskaje zawarušeńnie kala zbrajeńnia, kab źmieracca z Anhlijaj, wyhladaje adnak tolki na wymachiwańnie šablaj dziela pastrachu, bo ŭ sapraŭdnaści trudna niebahataj Italii dy zraŭniacca aružnaj siłaj z bahataj Anhlijaj.

Treba adnak pryznać, što hetkaje pastupańnie Italii pryčyniaje anhielskamu ŭradu nia mała kłopatu. Pryhetym dyplomatyčnyja zachady italijanskaha ŭradu ŭ Eŭropie i asabliwa pajezdka Musoliniaha ŭ Libiju, ab čym my pisali ŭ prošłym numary, škirawany tak-ža prociŭ intaresaŭ Anhlii.

Hetkaja palityka stwaraje napružanaść miž Italijaj i Anhlijaj, i dziela hetaha mnohija eŭrapejskija palityki spadziajucca, što anhielska-italijanskaja wajna moža wybuchnuć u kožnuju paru.

Wialiki palityčny praces na Wałyni

Na Wałyni maje adbycca sudowy praces 43 siabroŭ arhanizacyi „Ukrainski Narodny Kazacki Ruch“, jakaja hatowiłasia da zbrojnaha paŭstańnia prociŭ Polskaj dziaržawy.

Пісьмы з вёскі

Кароткія весткі.

(З Навагradчыны).

Сярод нашага сялянства можна спасьцерагчы сільнае імкненьне да навукі, да асьветы, да веды. Не зважаючы на цяжкое палажэньне жыцьця, многія купляюць беларускія лемантары („Першыя Зярняткі“ і „Зорка“) і хатнім спосабам вучаць дзяцей беларускай граматы, а так-жа саматужна вучацца і старэйшыя. Адна бяда, што ня ўсюды можна купіць беларускі лемантар і падручную для навукі кніжку. Беларуская інтэлігенцыя павінна паклапаціцца, каб у прадажы былі беларускія лемантары і кніжкі прынамсі ва ўсіх большых нашых мястэчках.

Аб масавым кольпортары беларускіх газэт. На вёсцы адчуваецца вялікі недахоп беларускіх газэт. Беларусы ўжо адчуваюць вялікую патрэбу сваей штодзеннай газэты. Дзеля таго, што няма беларускай штодзеннай газэты, сяляне купляюць штодзенныя газэты расейскія. Дзіўна, што ў Навагрaдку ніколі няма на рынку ў прадажы ніякай беларускай газэты, а нашаму беларускаму сялянству ўсюды падсоўваюць газэты расейскія. Нам трэба парупіцца, каб беларускаму сялянству даць газэту беларускую, бо расейскія газэты робяць на нашае сялянства свой, расейскі ўплыў. Беларуская вёска патрабуе ўжо газэты. Дык трэба ёй даць газэту, але сваю, родную, беларускую.

Царкоўная справа. Па сёлах пайшлі чуткі, што ў цэрквах будзе заведзена літургія папольску і будуць польскія пропаведзі. Гэтыя чуткі пашырыліся асабліва тады, калі Горадзенскі і Навагрaдзкі епіскап Сава даў загад сьвяшчэньнікам, каб яны добра навучыліся польскай мовы. Сяляне кажуць, што калі будзе ў царкве папольску літургія і будуць польскія пропаведзі, яны перастануць хадзіць у царкву.

На мой пагляд, трэба у царкве да нашага народу гаварыць пропаведзі ў роднай яго мове — пабеларуску, а Службу Божу адпраўляць пацаркоўна-славянску. Гэта зблізіць Царкву да народу і народ зблізіцца да Царквы.

У Бярозу-Картускую. Адміністрацыйныя ўлады выслалі ў лагеры адасабненьня, у Бярозу-Картускую жыхара в. Ждановічы Ю. Пячуру (польская прэса падала памылкова „Пяцюка“) за антыдзяржаўную дзейнасьць. Пячура калісь быў дзейным сябрам Акружной Управы ТБШ у Навагрaдку.

— Акружны Суд засудзіў трох жыхароў в. Ждановічы на тры месяцы астрогу за пяяньне камуністычнай песьні. Кару гэтую суд спыніў (завесіў) на пяць гадоў.

У в. Карнышы ёсьць польская арганізацыя — коло млодзежы вейскай, у якой апынулася і сьведамая беларуская моладзь. У „коле“ адбылася „чыстка“ і выгналі з гэтага „кола“ за нестатутовую дзейнасьць найбольш дзейных сяброў Веру Жыгалянку і Лахмача.

Выгнаным з „кола“ раджу вясьці культурную працу і без арганізацыі.

Справа беларускай школы. Аб патрэбе беларускай школы гавораць многія і ўсе разумеюць, што дзяцей вучыць трэба. Але каб адчынілі ўлады для нашых дзяцей беларускую школу закон вымагае выражэньня волі бацькоў або апякуноў дзяцей. Дзеля гэтага трэба падаваць дэклярацыі на беларускую школу. Дык усе тыя бацькі і апякуны, што хочаць, каб іхнія дзеці вучыліся ў школе пабеларуску, павінны падаваць школьным уладам спэцыяльныя дэклярацыі. Форма гэткай дэклярацыі і спосаб падаваньня абазначаны законам і міністэрскім распараджэньнем. Гэткія інструкцыі, як падаваць дэклярацыі на беларускую школу павінна мець кожная беларуская арганізацыя і кожная рэдакцыя беларускай газэты. Дык у гэтай справе туды трэба і зварочвацца.

Выбары солтысаў. Ужо выбраныя солтысы. Становішча солтыса цяпер даволі адказнае. Солтыс у сяле — гэта адміністратар і адначасна старшыня Грамадзкай рады — малога вясковага самаўраду. Нашыя солтысы, выконваючы свае абавязкі, не павінны забывацца аб тым, што яны прадстаўнікі беларускіх вёсак, у якіх расьце і разьвіваецца маладая беларуская культура, якой нідзе няможна нішчыць, а толькі ствараць нармальныя варункі дзеля яе разьвіцьця.

Курсы. У м. Уселюбе у канцы мін. году пачаліся культурна-асьветныя курсы агульныя і коопэратыўна-гаспадарчыя. Утрыманьне для курсантаў дармавое. Пасьля сканчэньня курсу адбываюцца вечарыны пры музыцы духовага аркестры. На курсах аднак настрой моладзі больш чымсь мінорны. Адміністрацыя курсаў ня можа выклікаць натуральнага здаваленьня курсантаў. Курсы гэныя арганізаваны Л.О.П.П. Зашкольная асьвета павінна праводзіцца так-жа ў роднай мове, а інакш марнуецца толькі час, энэргія і грошы.

Весткі з Смургонь.

Лепш было-б пісаць аб добрых справах, але іх каля нас ня чуваць і трэба пісаць аб благіх, каб яны больш не паўтараліся.

— у в. Слапсны 14 сакавіка жонка засекла сякерай сьпячага мужа.

— У в Перавесе 20 сакавіка зьнячэўку застрэліўся хлапчук, пры гэтым раніў свайго малодшага брата.

— 21 сакавіка знайшлі ў рацэ каля Старгонь топяльніка, Бохана, які ўтапіўся быццам будучы п'яным.

Гэтыя сумныя здарэньні сьведчаць, як нізка ўпала ў нашых ваколіцах мораль, здаровы рассудак і з гэтым жыцьцёвае практычнае самаўзгадаваньне. На гэты заняпад трэба зьвярнуць належную ўвагу і трэба працаваць дзеля падняцьця маралі і агулам дзеля падняцьця культурнага роўня і духовага і матар'яльнага.

Дзеля падняцьця маралі наўперад павінна працаваць духавенства, якога ў нас хапае. Але нашае духавенства мусіць так-жа ўпарадкаваць свае адносіны да народу. Прыкра пісаць, але трэба, што ў нашым праваслаўным прыходзе ўжо даўно цягнецца спор парафіян з настаяцелем і ня ведама калі ён кончыцца.

Айцы духоўныя, кідайце споры з народам і шукайце дарог у народ для Слова Божага! А гэтую дарогу паказвае Хрыстос. Дык ідзіце гэтай дарогай, а тады і народ вас зразумее і спораў з народам нябудзе.

Праваслаўны беларус.

Ciažkaja dola.

Windziuny, Šumskaj woł., Wil.-Trockaha paw. Wialikaj i wiasiołaj nawinoj była dla nas wiestka ab adčynieńni pastanowaj Sudu śpiarša začynienaj „Bieł. Krynicy“. Z hetaj nahody wyražaje našaja wioska ščyraje pažadańnie dalejšaj karysnaj pracy našaj „Krynicy“ dziela dabra narodu. Usim pracaŭnikom, što hurtujucca kala „Bieł. Krynicy“ ŭ pracy dziela dabra narodnaj sprawy — pamažy Boža! Niachaj „Bieł. Krynica“ ŭświedamlaje i praświačaje našych ciomnych sialan biełarusaŭ. Šmat jana ŭžo zrabiła raboty, ale jašče šmat i jość što rabić. Dyk i my budziem razam z „Krynicaj“ rabić našuju narodnuju rabotu.

— Našaja wioska razyjšłasia na chutary. Pakulšto jašče sialanie nie zahaspadarylisia na nowych haspadarkach, dyk ciapier nadta ciažka.

Na chutary razyjšlisia ŭ nas u 1934 h. Pierabudoŭwacca treba było ŭ 1935 h. Tady Bank abiacaŭ dać pazyčku, ale tolki toje i było, što abiacaŭ, bo pazyčku pačaŭ dawać tolki sioleta — u 1937 h. Wiedama, sialanie musili zdabywać hrošy na pierabudoŭku z swaich haspadarak;

pradawali nie ŭparadku skacinu i zbywali što inšaje, kab tolki pierabudawacca, a dziela taho zusim abiadnieli. A dzie biednata, tam hora i maralny ŭpadak. Našyja sialanie stalisia panuryja i niewiasiołyja, niekatoryja nawat užo nia cikawiacca i swaimi haspadarkami, a niekatoryja da biazpamiaci pjuć harełku.

Braty, kidajcie pić harełku, hlańcie na świet Božy wiesialej! Našaje hora my pieramožam sami, tolki treba chacieć jaho pieramahčy. Dyk pracujma, wučemsia, i miejma nadzieju, što budzie lepš, dyk usie złybiady źhinuć i žyćcio paprawicca.

J. Kukałowič.

Prywiet.

Kimiany, Wil.-Trockaha paw. Hetym pasyłaju prywiet „Bieł. Krynicy“ za jaje stojkaść i abaronu sialanskaj i biełaruskaj sprawy. Paśla jaje adčynieńnia žadajem joj bolšaha raźwićcia, kab našaja „Krynica“ stałasia štodziennaj hazetaj. Sapraŭdy „Bieł.Krynica“ heta wialikaja kniha sučasnaha biełaruskaha adradžeńnia.

Adnačasna pasyłaju prywiet dla ŭsich supracoŭnikaŭ našaj „Krynicy“. Biełaruskija sialanie čujuć chto ich pryjacieli i zaŭsiody jość dušoj z Wami braty, supracoŭniki „Bieł. Krynicy“. Imiam sialanskaha sumleńnia wyražaju sialanskaje słowa, choć nie krasamoŭnaje, ale ščyraje, što sialanie razumiejuć Was, braty supracoŭniki „Bieł. Krynicy“, bo i Wy razumiejecie sialan, bo „Bieł. Krynica“ sapraŭdy sialanskaja hazeta. Biełaruskija sialanie razam z Wami jšli dasiul i buduć išci dalej da lepšaj budučyni. Dyk idziemo razam da praŭdy, da światła, da ščaścia!

Sasnoŭščyk.

Małaziamielnyja.

Repišča, Brasłaŭskaha paw. Wa ŭsiej wakolicy kala nas mnoha sialan małaziamielnych, ale našaja wioska, heta typowaje małaziamielje biełaruskaje siało. Pačatkawyja i najbolšyja nadziełу sialanskich haspadarak 3 dziesiaciny ziamli. Hetyja 3 dziesiacinnyja „dwary“ ciapier razdroblenyja tak, što niekatoryja haspadarki majuć 0,25 dziesiaciny. Na hetych „haspadarkach“ žywuć sialanskija siemji i hadujucca ludzi, jakija ŭmiejuć pracawać tolki na ziamli. Pryhetym treba dadać, što hetyja haspadary taksama płaciać padatki i taksama i tut źbirajuć achwiary na biezrabotnych.

Kali-ž heta pryjdzie toj čas, što pačniecca ziamielnaja reforma i kali našyja sialanie dastanuć naležnyja i adpawiednyja abšary ziamli? Ziamielnaj reformy — nadziełu małaziamielnych sialan ziamloj našyja sialanie čakajuć užo daŭno.

H. P.

Słužy panu wierna, dyk jon... nos adwiernie.

Tabaryški, Wil.-Trockaha paw. U nas, jak užo pisałasia ŭ „Bieł. Krynicy“ ŭ min. hadoch, adbywajecca praces biełaruskaha narodnaha adradžeńnia. Suproć hetaha naturalnaha pracesu stanuŭ miascowy ks. probaršč. Zaŭładaŭ jon „Stow. Młodz. Polskiej“, pašyraŭ endeckuju hazecinu „Naš Pšyjaciel“, z ambony wytykaŭ palcam świedamych i dziejnych biełarusaŭ, a paśla załažyŭ polska-endeckuju placoŭku pad nazowam „St. Mł. Katolickiej“. Słowam, ks. probaršč siarod našych biełarusaŭ staraŭsia i starajecca pašyryć upływy polskaj endecyi. U hetym jamu ščyra pamahaŭ arhanisty až praz 12 hadoŭ. Ale ŭsiamu bywaje kaniec. Končyłasia i družba arhanistaha z probarščam — probaršč adkazaŭ arhanistamu pasadu i pačałasia miž imi kałatnia. Peŭnie-ž, kiepska robić probaršč, što pazbaŭlaje čaławieka pracy i hetym samym chleba, ale heta sprawa jaho maralnaha i etyčnaha razumieńnia. Nam tut idzie nie ab heta. My zwaročwajem uwahu na toj fakt, što družnaje supracoŭnictwa probaršča z arhanistym nia spyniła naturalnaha razwoju biełaruskaha ŭ nas adradžeńnia i jano jdzie swajej pryrodnaj darohaj. Pryhetym treba adznačyć i toj sumny fakt, što b. prezas ksiandzoŭskaha „St. Mł. P.“ u bojcy parezaŭ nažom swajho praciŭnika. Z hetaha bačym, što endeckaja akcyja siarod biełarusaŭ maralna i etyčna nie ŭzhadoŭwaje ludziej. Dyk my, biełarusy, idziemo swajej biełaruskaj darohaj, bo čužyja šlachi zawodziać u ciemru.

Jurka Burałom.

Закон аб дзяржаўных граніцах.

Ад 24 красавіка сёл. ў Польшчы ўходзіць у сілу новы закон аб абароне дзяржаўных граніцаў. (Dz. U. Nr. 11, poz. 83 i Nr. 12, poz. 84, 1937). Закон гэты датыча ў першую чаргу беларускіх вёсак і мястэчак і таму трэба з ім у пару пазнаёміцца, бо нязнаньнем закону нігдзе тлумачыцца ня можна. Вот-жа паводле гэтага закону ўся прыгранічная паласа падзелена на тры часьці:

а) *паласа гранічнай дарогі* — гэта прастор грунту ўшырку 15 мэтраў, рахуючы ад лініі граніцы або ад берагу гранічнай вады;

б) *надгранічная паласа*—абхоплівае прастор уздоўж граніцы ушыркі 2 кілёмэтры, рахуючы ад гранічнай лініі. Прастор гэты можа быць пашыраны да 6 клм, або і звужаны ніжэй 2 клм.

в) *гранічная паласа* абыймае прастор паветаў, якія прылягаюць да дзяржаўнай граніцы (да 30 клм.). Міністар Унутр. Спраў можа гэты прастор пашырыць яшчэ больш.

Паласа гранічнай дарогі прызначана для гранічнай стражы. У надгранічнай паласе ўведзены гэткія абмежаваньні:

а) Купляць ці браць у арэнду нярухомасьці (зямлю, дамы) можна толькі з дазволу ваяводы. Таксама трэба дазволу ваяводы на атрыманьне спадку паводле тэстаманту; спадак спадкаемца з моцы самога закону (напр. сын па бацьку) дазволу не патрабуе.

б) Сталыя і тымчасовыя жыхары надгранічных палосаў, калі толькі кончылі 13 год, павінны мець пашпарты („dowód“).

в) Каб атрымаць дазвол на права жыцьця, нават тымчасовага, трэба спачатку мець дазвол ад паветавага старасты і тады толькі старацца аб дазвол у ваяводстве.

Пастановы з-пад літ. *б* і *в* не абавязуюць тых, хто жыў у надгранічнай паласе 6 месяцаў прад 24.IV.1937 г., г. зн. ад 24.X.1936 г. або хто зьяўляецца сем'янінам гаспадаркі паложанай у надгранічнай паласе.

Ваявода азнача ў надгранічных палосах такія прасторы, дзе:

а) Кожны навапрыбыўшы павінен да 24 гадзін запісацца ў гміне, або ў солтыса, дзе і атрымае адпаведнае пасьведчаньне.

б) Начны рух — ад заходу да ўсходу сонца — паза межамі хат і панадворка забаронены, а дазволы на гэткі рух, аднаразовыя ці сталыя, выдае староства.

Асабовы рух у гранічнай паласе забаронены, часта нават тады, калі гэта ёсьць публічная дарога.

У надгранічнай паласе без спэцыяльнага дазволу староства ня можна мець фатаграфічных апаратаў, а тымбольш фатаграфаваць. Дазволу староства трэба так-жа на завядзеньне тэлефону, тэлеграфу, гадаваньне ўсякіх галубоў; на радіовыя апараты дзеля слуханьня (не надаваньня!) дазволу ня трэба. Уся скаціна і коні падлягаюць рэстрацыі ў гміне; там-жа трэба запісываць і ўсякую зьмену ў жывёлагадоўлі — куплю, продаж, прыплод, страту і г. д. Абавязак гэткага запісваньня ляжыць на ўласьніках жывёлы.

Roznyja wiestki

Z POLŠČY.

Baraćba z darahoŭlaj. Z pryčyny padymańnia cenaŭ na spažywieckija pradukty i inšyja tawary Ŭrad raspačaŭ baraćbu z darahoŭlaj. Ŭ źwiazku z hetym ułady pačali „raźwiazywać“—kasawać sajuzy pramysłoŭcaŭ — karteli. Dziela baraćby z darahoŭlaj zarhanizawana specyjalnaja kamisija.

Raźwiazańnie haradzkoj Rady ŭ Łodzi. Ministar Nutr. Spraŭ raźwiazaŭ haradzkuju Radu ŭ Łodzi. Paśla hetaha adbyŭsia tam demanstracyjny strajk rabotnikaŭ.

Raźwiazańnie akademickich arhanizacyjaŭ. Ministar Aświety raźwiazaŭ niekatoryja studenckija arhanizacyi, jakija prajaŭlali palityčnuju dziejnaść. Hetyja stud. arhanizacyi mieli charaktar nacyjanalistyčny i prajaŭlali nacyjanalistyčnaje pačućcio macniej zdarowaha razsudku.

Z ZAHRANICY.

Praśled chryścijanstwa ŭ Niamieččynie. Hitleraŭskaja ŭłada zaŭziata praśleduje ŭ Niamieččynie chryścijanstwa. Najbolš zajadła zmahajucca hitleraŭcy z Katalickim Kaściołam.

Žywučaść chryścijanstwa ŭ SSSR. Nie zwažajučy na baraćbu balšawizmu z relihijaj u SSSR, chryścijanstwa tam hierojska wytrymliwaje praśled. Apošni pierapis nasielnictwa ŭ Sawietach wyjawiŭ, što 40 prac. usiaho nasielnictwa adkryta wystupaje wieručymi i staić za relihiju.

Padzieł Palestyny. Anhielskaja specyjalnaja kamisija prydumała prajekt padziełu Palestyny na dźwie aŭtanamičnyja čaści — dla Arabaŭ i Žydoŭ.

U Japonii. Japonski ŭrad ciapier raspačaŭ zmahańnie z swaim parlamantam — raźwiazaŭ parlamant i wyznačyŭ nowyja wybary.

Беларуская Кнігарня „Пагоня“

ў Вільні пры вул. Завальнай 1 прапануе наступныя кніжкі:

А.

Абдзіраловіч Ігнат. — Адвечным шляхам. Выд. Бел. Выд. Т-ва. Вільня, 1921 г. Дасьледзіны беларускага сьветагляду, бач 72 . . . 0.50

Абарона зямлі, цікавае апавяданьне аб тым, як людзі адваявалі зямлю ад двара і чужнікоў, бач. 30 . . . 0.15

А. В. — Унія на Палесьсі. Вершаваная дыскусія уніята, праваслаўнага манаха і р.-к. ксяндза. Выд. Ісусавага Таварыства. Альбэртын, 1932 г., бач. 16 . . . 0.20

A. W. — Betlejka. Sceničny abrazok u wadnym akcie. Wyd. „Chryścijanskaj Dumki“. Wilnia, 1932 h., bač. 16 . . . 0.20

A. W. — Kaniok-Harbuniok, wieršawanaja bajka pawodle Jeršowa. Wyd. „Bieł. Krynicy“. Wilnia, 1932 h., bač. 86 . . . 0.40

A. W. — Biełaruskija Cymbały. Zbornik wieršaŭ z krytyčnym narysam Ad. Stankiewiča ab žyćci i tworčaści A. W. Wyd. Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury. Wilnia, 1933 h., bač. 72 . . . 0.50

Adwažny Wincuk. — Kazka ab rybaku i rybcy. Wyd. St. Hlakoŭskaha i J. Najdziuka. 1935 h., bač. 29 . . . 0.20

Adwažny Wincuk. — Chłapiec. Powieść. Wyd. „Bieł. Krynicy“. Wilnia 1935 h., bač. 242 . . . 1.50

Adwažny Wincuk. — Hanuliny Kłopaty (Humarystyčnaje apawiadańnie wieršam). Wyd. „Bieł. Krynicy“. Wilnia 1935 h., bač. 64 . . . 0.30

A. W. — Jak Kaziuk sabraŭsia da spowiedzi. Wyd. „Chryśc. Dumki“. Wilnia, 1928 h. bač. 68 . . . 0.30

A. W. — Kaziukowa žanimstwa. Wyd. „Chr. Dumki“. Wilnia, 1929 h. bač. 78 . . . 0.30

Aniśko D. — Da biełaruskaha narodu (Zaklik da wiernaści). Wyd. „Chr. D“. Wilnia, 1935 h. bač. 39 . . . 0.20

Aniśko D. — Usio ŭ miłaści. Wyd. „Chr. Dumki“. Wilnia, 1933 h. bač. 52 . . . 0.30

Aniśko D. — Dla čyjho dabra! (Da sprawy biełaruskaj mowy ŭ kaściele). Wyd. „Chr. Dumki“. Wilnia, 1934 h. bač. 15 . . . 0.15

А. К.—Казкі. Выданьне У. Знамяроўскага. Вільня, 1928 г. бач. 32 . . . 0.20

Акінчыц Ф. — Аграрная коопэратыўная палітыка ў будучыні. Выд. „Новага Шляху“. Вільня, 1935 г. бач. 36 . . . 0.20

Акінчыц Ф. — Чаму гэтак сталася . 0.15

Акінчыц Ф.—Правакацыя Беларускага Народу (Да справы б. старшыні Грамады Б. Тарашкевіча). Друк. У. Знамяроўскага. Вільня, 1933 г. бач. 36 . . . 0.30

Аляхновіч Ф. — У лясным гушчары. Казка ў вадным акце для дзяцей малодшага веку. Выд. Беларускага Выдавецтва ў Латвіі. Рыга, 1932 г. бач. 14 . . . 0.20

Аляхновіч Фр. — Птушка шчасьця. П'еса ў 3 актах. Выд. Бел. Музыкальнага Драм. Гуртка ў Вільні. Вільня, 1922 г. бач. 38 . . . 0.40

Аляхновіч Фр. — Дрыгва. Драма ў 6-ёх абразох. Выд. Бел. Час. Рады. Вільня, 1925 г. бач. 64 . . . 0.75

Аляхновіч Фр.—Калісь. Сцэнічны абразок у 2-х актах. Выд. Камісарыяту Асьветы. Вільня, 1919 г. бач. 32 . . . 0.40

Аляхновіч Фр. — Пан Міністар. Камэдыя ў 3-х актах. Выд. газэты „Голас Беларуса“. Вільня, 1924 г. бач. 54 . . . 0.40

Аляхновіч Фр. — Заручыны Паўлінкі. П'еска ў 1 акце з песьнямі і скокамі. Адбітка з „Беларускага Звону“. Вільня, 1921 г. бач. 22 . . . 0.35

Аляхновіч Фр. — Няскончаная драма. П'еса ў 4-х актах. Выд. Бел. Выд. Т-ва. Вільня, 1922 г. бач. 72 . . . 1.00

Аляхновіч Фр.—Шчасьлівы муж. Камэдыя ў 4-х актах. Выд. Музык.-Драматычнага Гуртка ў Вільні, 1922 г. бач. 68 . . . 1.00

Аляхновіч Фр.—Беларускі тэатр. Выд. Бел. Грамадзянскага Сабраньня ў Вільні. Вільня, 1924 г. Гістарычны нарыс беларускага тэатру, бач. 75 . . . 0.75

Андэрсэн Ганс-Хрыстыян. — Казкі. Выд. Мін. Бел. Спраў. Коўна. бач. 64 . 0.50

Арсеньнева Н.—Пад сінім небам. Выд. Б. Клецкіна. Вільня, 1927 г. Зборнік вершаў, бач. 144 . . . 1.20

Астроўскі Р.—Космографія. Бел. Выд. Т-ва. Вільня, 1924 г. Школьны падручнік, бач. 84 . . . 1.25

Астроўскі Р.—Арытмэтычны задачнік для 4, 5, і 6 аддзелаў пачатковых школ. Часьць II (Выд. для настаўнікаў). Вільня, 1929 г. бач. 112 . . . 2.00

Астроўскі Р. — Арытмэтычны задачнік для 4, 5, 6 аддзелаў пачатковых школ (1, 2 і 3 кл. гімназіі) Часьць II. (Выд. для вучняў) Выд. Б. Клецкіна. Вільня, 1929 г. бач. 136 і 17 табліц . . . 2.00

Астроўскі Р. — Беларускі правапіс. Выданьне 2-ое папраўленае і дапоўненае. Выданьне Б. Клецкіна. Вільня, 1930 г. бач. 148 . . . 2.00

Рэдактар . ДАСЮКЕВІЧ Беларуская Друкарня ім. Фр. Скарыны ў Вільні, Завальная 1—2. Выдавец А. ШУТОВІЧ